# Дэкрэт № 3 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва»: як пацвердзіць, што грамадзянін працуе ці навучаецца за мяжой

У адпаведнасці з пунктам 5 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 2 красавіка 2015 г. № 3 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва» **працаздольныя грамадзяне, не занятыя ў эканоміцы, аплачваюць паслугі,** якія вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, **па цэнах (тарыфах), што забяспечваюць поўнае пакрыццё эканамічна абгрунтаваных затрат на іх аказанне** (далей – паслугі з пакрыццём выдаткаў), **пасля ўключэння** гэтых грамадзян **у спіс** працаздольных грамадзян, якія не занятыя ў эканоміцы ды плацяць за паслугі з пакрыццём выдаткаў.

Грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія працуюць за мяжой ці якія атрымліваюць адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі за мяжой, **пры прад'яўленні пацвярджальных дакументаў**, не ўключаюцца ў спіс працаздольных грамадзян, якія не занятыя ў эканоміцы ды плацяць за паслугі з пакрыццём выдаткаў.

**Прадастаўленне дакументаў, якія пацвярджаюць працу або навучанне за мяжой, – гэта права, а не абавязак грамадзяніна.**

## Як пацвердзіць занятасць

Для **пацверджання сваёй занятасці** названым катэгорыям грамадзян неабходна **прадаставіць у** стала дзеючую камісію па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва **па месцы рэгістрацыі дакументы, якія пацвярджаюць ажыццяўленне працоўнай дзейнасці або навучанне ў дзённай форме атрымання адукацыі.**

Такімі дакументамі могуць з'яўляцца:

**для грамадзян, якія працуюць за мяжой:**

- ✓ копія працоўнага дагавора (кантракта);
- ✓ копія пасведчання, дазволу, ліцэнзіі на ажыццяўленне адвакацкай, натарыяльнай дзейнасці;
- ✓ копіі іншых дакументаў, якія пацвярджаюць факт працоўнай дзейнасці;

**для грамадзян, якія атрымліваюць адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі за мяжой:**

- ✓ даведка з установы адукацыі;
- ✓ копія дагавора на аказанне адукацыйных паслуг;
- ✓ копіі іншых дакументаў, якія пацвярджаюць факт навучання.

Звяртаем увагу!

**Дакументы** мусяць быць **прадстаўленыя з афіцыйным перакладам** на рускую ці беларускую мову.

**Пераклад мусіць быць афіцыйна засведчаны** арганізацыяй, нададзенай правам пацверджання правільнасці перакладу дакумента ў адпаведнасці з заканадаўствам краіны, на тэрыторыі якой ажыццяўляецца пераклад:

натарыяльна;

апастылем;

іншай існуючай формай засведчання афіцыйнага перакладу дакументаў у адпаведнасці з заканадаўствам краіны, на тэрыторыі якой ажыццяўляецца пераклад дакумента.

**Спосаб прадастаўлення дакументаў у камісію**


электронная пошта


паштовая сувязь


асабісты зварот

**Інфармацыя пра** месца знаходжання, паштовы адрас ды адрас электроннай пошты стала дзеючых камісій па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва **размешчана на афіцыйных сайтах** раённых, гарадскіх выканаўчых камітэтаў, адміністрацый раёнаў у гарадах.

**Фармат прадастаўлення дакументаў**

Пры **накіраванні копій дакументаў** па электроннай пошце **памер файла** не павінен перавышаць **5 Мб**.

Дапускаюцца наступныя фарматы файлаў: pdf, jpg, jpeg, png.

**Рэкамендаваныя тэрміны прадастаўлення дакументаў**

**Першыя спісы** працаздольных грамадзян, якія не занятыя ў эканоміцы ды плацяць за паслугі з пакрыццём выдаткаў, будуць **сфарміраваныя** на **1 лютага 2019 г.**

**У сувязі з гэтым дакументы, якія пацвярджаюць працу або навучанне за мяжой, прадастаўляюцца** ў камісіі ў тэрмін **да 21 студзеня 2019 г.**

З улікам таго, што спісы фармуюцца **штоквартальна**, пазней **пры прадастаўленні дакументаў у камісію просім арыентавацца на тэрміны фармавання спісаў на аплату паслуг з пакрыццём выдаткаў**. У гэтай сувязі раім дакументы падаваць у камісію:

**да 21 красавіка; да 21 ліпеня; да 21 кастрычніка; да 21 студзеня.**

**Тэрмін, на працягу якога грамадзянін не ўключаецца ў спіс, вызначаецца камісіяй на падставе прадстаўленых дакументаў.**

**УВАГА!!!**

**Пры наяўнасці ў грамадзян пытанняў па рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 2 красавіка 2015 г. № 3 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва»** (тлумачэнні, прадастаўленне дакументаў, якія пацвярджаюць занятасць, складаная жыццёвая сітуацыя і інш.) неабходна **звяртацца** ў пастаянна дзеючыя **камісіі** па каардынацыі работы па садзейнічанні занятасці насельніцтва **па месцы рэгістрацыі**.